Бярозка

№ 4/2012(1007)



◉ **Верасок**

◉ **Кацярына ЮРКЕВІЧ**
Інстытут незвычайных асоб

◉ **Кацярына БЕЗМАЦЕРНЫХ**
Адрозныя малюнкі нашых лёсаў

◉ **Марыя СЯЦКО**
Рэпетытар у тваім жыцці

◉ **Марына ВЕСЯЛУХА**
Дуда ў року



bjarozka@mail.ru
vk.com/club 34570145







Творы вучняў ліцэя № 1 г. Мінска

Беларусь — мая Радзіма

Беларусь... Як шмат значыць гэтае слова для нас — яе дзяцей. Гэта і родныя, знаёмыя з дзяцінства краявіды, і прыгожыя, працавітыя, сціплыя людзі. Гэта і родны дом, у якім нарадзіўся, і маміна мова, і сцежка, па якой пайшоў упершыню, і клёкат буслоў...

Жывём мы на гэтай чароўнай, багатай зямлі і за штодзённымі клопатамі не заўважаем яе хараства, прывыкаем да ўсёй гэтай прыгажосці. І па-сапраўднаму адчуваем Радзіму толькі ўдалечыні ад яе. Як хочацца тады пачуць гучанне роднай мовы, удыхнуць роднае паветра.

Радзіма — не толькі тэрыторыя, дзе нарадзіўся і жыве чалавек, а гістарычная, культурная спадчына яго народа. Беларусь — зямля нашых продкаў, багатая на падзеі і імёны. Асновай жа духоўнага скарбу людзей, іх творчасці з'яўляецца мова. Яна не толькі сродак зносін, але і жывая гісторыя, бо ў ёй знайшлі адлюстраванне ўсе падзеі чалавечага жыцця.

Яна ШЭБЕКА

* * *

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай,
каб не ўмёрлі!..
Францішак БАГУШЭВІЧ

Бядота жудасная здарылася з намі:
Мы беларусы толькі напалову.
Жывём у родным сваім краі,
Не ведаючы роднай сваёй мовы.

Не ведаем, як гучна і прыгожа
Гаворка беларуская ліецца,
І не жадаем здзейсніць падарожжа
За ёй ва ўласнае разгубленае сэрца.

Але зрабіць нам неабходна гэта,
Бо нельга жыць без роднай мовы ў свеце.
Такі загад быў дадзены паэтам:
Нам трэба мову ўспомніць, каб не ўмерці.

* * *

Жыццё — бясконцае чаканне.
Чакаюць нечага усе,
І кожны дзень, пачаўшы зрання,
І кожну ноч, нават у сне.
Адзін чакае свайго шчасця,
Здзяйснення сноў, здзяйснення мар.
Ды колькі шчэ яму чакаці?
Ці шчасце — гэта не падман?

А іншы ведае, напэўна:
Даўно прадвызначаны лёс.
Чакае ён падзеі пэўнай.
Чакае радасці і слёз.

Я не жадаю сабе раю,
Яго не здзейсніць на зямлі.
Свайго я лёсу не чакаю —
Я здольны сам усё змяніць!

Андрэй К.

* * *

Мне хочацца плыць па жыцці, як па хвалях,
І бачыць бляск зорак у кроплях вады,
Узняцца да неба на сініх скрыжалях,
Не чуць, як ляцяць маладыя гады.

Вось толькі чаму так заўсёды бывае?
Няпроста забыць мне хвіліну адну.
Я бачу, як хваля мая адплывае —
Цягнуся за ёю... Я не патану.

Сяргей ЗАВАРЫН

Роздум

Кожную ноч у небе з’яўляўся Месяц. Ён уважліва сачыў за людзьмі і ніяк не мог зразумець, чаму яны ўвесь час спяшаюцца.

— Людзі проста нічога не ведаюць пра жыццё. Яны не шануюць кожнае імгненне, як мы! — тлумачылі Зоркі ў небе.

Месяцу гэты адказ не спадабаўся. Ён хацеў сам запытацца, але Зямля была так далёка.

А на гэтай зямлі жыла маленькая дзяўчынка. Бацькоў і сяброў у яе не было; дома, у які б яна заўсёды магла прыйсці, таксама не было. І ўвесь свет здаваўся ёй такім няўтульным і халодным. Але кожны вечар яна дзякавала Богу за дзень. І засынала са слязьмі на маленькім бледным тварыку, а вусны дзіцяці шапталі словы малітвы.

У гэты год на Зямлі было вельмі холадна. У адну ноч загінула маленькая дзяўчынка. Але свет не змяніўся: людзі спяшаліся далей.

Неба заплакала.

— Чаму ты плачаш? — запытаўся Месяц.

— Таму, што гэта малая істота загінула і цяпер не будзе адчуваць ні цяпла, ні холаду, ні радасці, ні страху.

Раптам Месяц убачыў нешта падобнае да знічкі, але трошкі большае.

— Хто ты? — спытаў ён.

— Я душа.

— Напэўна, ты ведаеш, чаму людзі заўсёды спяшаюцца! — узрадаваўся Месяц.

— Так, я ведаю. Гэта жыццё. Яно вельмі падобна да зорак. Але бываюць людзі, жыццё якіх больш падобна да Леанідаў або да камет.

— А потым?


— А потым жыццё скончыцца, і ўсе яны паляцяць да неба. Вось і мне ўжо трэба ляцець.

— Затрымайся, калі ласка! Раскажы мне пра жыццё, пра людзей і душы.

Але душа ўжо знікла ў небе.

А Месяц застаўся жыць яшчэ на мільёны гадоў.

Марта ДЗЯБЁЛА



Інстытут незвычайных асоб



Сядзіба Герцэна

Будынак Літаратурнага інстытута знаходзіцца на сядзібе Герцэна. Гэта самы цэнтр Масквы, Цвярскі бульвар, 25. Пасля аўтамабільных пробак, макдональдсаў, чарговага мітынгу на Пушкінскай плошчы вы трапляеце ў маленькі зялёны двор з помнікам Герцэну, зарослым травой футбольным полем і закрытымі рамонтнай сеткай антычнымі скульптурамі на класіцыстычным франтоне. Інстытут сустракае вас не тое каб парадна, хутчэй як ёсць: савецкай прахласцю, знешняй непрыбранасцю. Дзе-нідзе косяцца прыступкі, электронны гадзіннік пастаянна збіваецца, спрачаючыся з сонечным святлом. Нехта грае на крыху расстроеным фартэпіяна, нехта не прапускае вас у вузкія дзверы, а нехта ўжо вітаецца, таму што ў Літінстытуце прынята вітацца з тымі, каго не ведаеш. Вы бачыце імянную аўдыторыю, уваходзіце і не знаходзіце там нічога асаблівага, акрамя партрэта. Там часта няма нават фіранак, а крэйда толькі рыпіць, але зусім не піша па старой дошцы. У двары ў траўні — таполевы пух, узімку — горы снегу. На ганку і любой лаўцы вас ахіне цыгарэтным дымам, затое вы пачуеце шмат цікавых гутарак: пра тугу Авідзія, аповесць з суседняга семінара, пра берагі Нявы, пра Усясветны сабор чацвёртага стагоддзя…

Навучанне

У пісьменнікаў «зрэнка ўнутр», і лекцыі тут чытаюць вусна, без праектараў, прэзентацый, хіба што са старажытнай картай на дошцы ці з мноствам кніг, прынесеных з сабою. Гэта часам называюць тут «ад сэрца да сэрца». Калі студэнт сядае за дальнюю парту, то часта для таго, каб пачытаць. І цалкам верагодна, што вы пачуеце такі дыялог:

— Што вы чытаеце на маіх занятках?

— Пушкіна.

— Што ж… Ці можна выгнаць за Пушкіна!

Але бывае і інакш: студэнт сядае «на галёрку» і, калі раптам чуе:

— Усё. Вы вольныя. Зрэшты, як і заўсёды, — няўцямна глядзіць на сваю так і не раскрытую кнігу.



Творчая атэстацыя студэнтаў.

Большасць лекцый тут чытаюць лепшыя прафесары ў сваіх галінах — сумленна, з павагаю, з агеньчыкам, за зусім не вялікія грошы.

Канешне, ёсць і сумныя, «мёртвыя» заняткі, на якія хадзіць не хочацца — як у кожнай ВНУ. Але пра іх і пісаць не хочацца. І знойдуцца людзі, якія скажуць вам, што Літінстытут ужо не той, што калісьці быў, што вучаць там хутчэй на чытачоў, чым на пісьменнікаў...

Вам сапраўды ў Літінстытуце ніхто не скажа, «як пісаць». Калі вы спытаеце — адкажуць, што ніхто не ведае і няма такой кнігі, дзе пра гэта можна прачытаць. «Выхоўвайце густ», «вучыцеся на добрых і дрэнных прыкладах», «вывучайце мову» і «пішыце паболей» — хто ж гэтага не ведае? Але менавіта так, крок за крокам, і адбываецца тут навучанне: пачынаючы са старажытных літаратур і латыні, стараславянскай мовы і дыялекталогіі... Вас нібыта ва ўсе бакі развіваюць (ва ўсе непрактычныя бакі, трэба зазначыць), вам сапраўды выхоўваюць густ, і на чацвёртым курсе, калі вы дойдзеце да горача жаданай на першым стылістыкі, вы можаце раптам зразумець, што ўсё гэта ўжо адчуваеце падсвядома.

Семінары

Па аўторках у Літінстытуце няма звычайных заняткаў, гэта дзень творчых семінараў. Гэтую сістэму можна параўнаць з тэатральнымі ВНУ: ёсць семінар (проза, драматургія, дзіцячая літаратура, крытыка, паэзія, нарыс і публіцыстыка, мастацкі пераклад), і ёсць майстар гэтага семінара. Кожны аўторак вы збіраецеся разам і абмяркоўваеце чыйсьці твор, падборку, эцюд. Абмеркаванні праходзяць па-рознаму, у кожнага семінара тут свой статут. Напрыклад, могуць назначацца галоўныя апаненты, пісацца рэцэнзіі, аўтару можа быць дазволена ці забаронена гаварыць (зыходзячы з таго, што «калі вы выдалі кнігу — вам няма больш чаго дадаць»), на аўтара могуць напісаць пародыю і іншае. Студэнты могуць наведваць не толькі свой семінар, але хадзіць і на любы іншы, хоць увесь аўторак з раніцы да вечара.

У Літаратурным інстытуце няма гучных імёнаў майстроў. Яны не прадаюцца мільённымі тыражамі. З найбольш вядомых аўтараў — Яўген Рэйн, Алеся Нікалаева, Віктар Малягін. Майстры часцей за ўсё старыя, даўно сівыя. І толькі першы, зманлівы погляд сумняваецца ў іх кваліфікацыі. Праз год-другі вучобы ў іх задума інстытута раптам адкрываецца ўнутранаму позірку скрупулёзнага студэнта.

Інтэрнат

Жывуць іншагароднія (і іншаземныя) студэнты ў інтэрнаце на Дабралюбава, у якім жылі калісьці і Мікалай Рубцоў, і Уладзімір Караткевіч, і Валянцін Акудовіч. У гэтым інтэрнаце ў спартыўнай зале вісіць баксёрская груша і стаіць піяніна, прыбіральшчыца вучыцца на паэзіі, а электрык — на нарысе і публіцыстыцы. У каго ў пакоі партрэт Пушкіна ці Блока — таму пашчасціла. Калі пішуць аб'явы, то з інверсіямі і вершавана, калі гуляюць, то ў «тайнага анёла» ці ў «тайнага дэмана». У чатыры гадзіны раніцы можа быць адчынена бібліятэка (у інтэрнаце яна свая), можна стаць першым слухачом якой-небудзь новай паэмы ці спрачацца ў курылцы: «Горкі? Ды хто такі Горкі!»

Першакурснікі традыцыйна ад усіх астатніх адрозніваюцца. На першым курсе шмат фрыкаў, нефармалаў любых напрамкаў, рознакаляровых валасоў, дзіўнага адзення, незразумелай мовы. Хлопец з пафарбаванымі пазногцямі і вейкамі можа трымаць у руках томік Гумілёва, а татуіраваная дзяўчына — чытаць антычную літаратуру ў чарзе ў душ. Да другога-трэцяга курса ўсе неяк выроўніваюцца, развіваючы цяпер хутчэй сваю ўнутраную, а не знешнюю арыгінальнасць. Але да любога вобраза выкладчык ставіцца спакойна. Як, жартуючы, тлумачыў гэта былы рэктар: «А раптам геній літаратуры?»

Паступленне

У Літаратурным інстытуце цяпер няма тых вар'яцкіх конкурсаў, што былі ў часы Савецкага Саюза. І паступаць цяпер можна адразу пасля школы — рэформа адукацыі не ўлічвае творчую спецыфіку ВНУ, таму сярэдні студэнт адчувальна «памаладзеў». Хаця ў Ліце па-ранейшаму можна сустрэць і трыццаці-, і саракагадовых студэнтаў. На іх глядзяць (калі ўсё ж задумаюцца пра іх узрост) з павагай і лёгкай зайздрасцю — бо ў іх і жыццёвы досвед, і куды больш пісьменніцкай практыкі. На завочным аддзяленні вучацца і студэнты з сівізной — гэтым тут нікога не здзівіш. Сюды часцей прыходзяць па адукацыю, а не па спецыяльнасць, згодна з поклічам сэрца, згодна з марай, як бы гэта ні гучала наіўна. Больш перспектыўна, але куды менш творча паступаць на мастацкі пераклад: перакладчыкі і выглядаюць тут інакш, і знаходзяцца «трошкі глыбей у рэальнасці».

Паступленне складаецца з двух этапаў, што вельмі зручна для тых, хто «сумняваецца». Спачатку аўтары дасылаюць свае творы, а майстры і студэнты старэйшых курсаў чытаюць іх і пішуць рэцэнзіі. Вывешваецца спіс — тых, хто прайшоў завочны тур і запрашаецца на іспыты. І толькі пасля — самі іспыты, два з якіх творчыя — эцюд (шмат у чым дзеля таго, каб пацвердзіць, што вы сапраўды аўтар дасланага рукапісу) і творчае сумоўе ў самым канцы. Дасылаць творы можна на некалькі напрамкаў адначасова. Канешне, самы вялікі конкурс у інстытуце на паэзію і прозу, а, напрыклад, на дзіцячую літаратуру ці нарыс і публіцыстыку яго амаль няма.

Ніхто не адмаўляе долі суб'ектыўнасці ў адборы будучых студэнтаў — бо ў кожнага майстра свае густы. Але справа бывае нават не ў гусце, а ў тым, што майстар бачыць, каму ён можа нешта «даць», а каму не. Шмат хто паступае

не з першага разу, і бывае, як і ў тэатральных ВНУ, адзін год — прапаў, другі год — пан.

Беларусы ў Літінстытут паступаюць на агульных падставах і маюць права вучыцца бясплатна. Адзіная розніца: калі ў вас ёсць медаль, яго ўсё роўна не залічаць, плюс, калі вы паступіце, ніхто не зробіць вам медыцынскі поліс, і вам давядзецца ці набыць яго, ці хварэць без даведак.

З беларускіх літаратараў у розны час у Літінстытуце вучыліся Уладзімір Караткевіч, Валянцін Акудовіч, Леанід Дранько-Майсюк, Людміла Рублеўская, Раіса Баравікова і іншыя.

Розныя факты

У Ліце ёсць дзве версіі таго, чаму выгналі Пялевіна: афіцыйная версія і версія першакурснікаў.

Абсалютна рэальны тэкст загада былога рэктара Есіна: «Предупредить Малых А., что в случае любовного продолжения той свиной обстановки, которую он создал в комнате общежития, — он будет жить на вокзале». Ці: «За пребывание в институте в нетрезвом виде объявить строгий выговор и предупредить, что в следующий раз за любой проступок они будут отчислены из института. О зеркале пока умолчу».

Інстытут маленькі, хатні — у вас не просяць студэнцкі білет ні ў бібліятэцы, ні нават калі выдаюць стыпендыю.

У Літінстытуце ёсць цудоўная кніжная крамка, маленькая, але сапраўды поўная скарбаў. На ўваходзе вісіць цыдулка: «Не хлопайце дзвярыма, іначай рухне сцяна».

Цяжка знайці ў гэтым інстытуце хлопца, які змог бы адрамантаваць камп’ютар ці збіць палічку для абутку ў інтэрнаце. У мяне быў такі сусед, яго адлічылі пасля першага курса. А вось дзяўчаты-праграмісты сустракаюцца!

Вельмі часта ў інтэрнаце перастаюць працаваць пральныя машыны. І калі іх доўга не рамантуюць, студэнты пачынаюць насіць тую вопратку, якую звычайна не носяць. Так фрыкі становяцца звычайнымі людзьмі, а звычайныя людзі — фрыкамі.

Студэнты ветраныя і часта «не ад гэтага свету», таму іх тут бясплатна кормяць цёця Тоня і дзядзя Міша. Кожную сераду і пятніцу, асабліва ў пост, у іх ёсць посная ежа.

Першы спектакль, які паставіў тэатр інстытута, быў паводле «Аблокаў» Арыстафана.

Калі я паступала ў Літінстытут, то ўжо на першай кансультацыі пачула тое, чым, думаю, дарэчна было б скончыць гэты артыкул: «Вучыцца ў Літінстытуце — гэта значыць абраць жабрацкую, але цудоўную прафесію. Калі вы паступіце — я віншую вас. Калі не — скажыце сабе: “Як мне пашчасціла ў жыцці”».

Кацярына ЮРКЕВІЧ

Адрозныя малюнкі нашых лёсаў

Чужы досвед назаўжды застаецца чужым досведам. І паўтарыць яго немагчыма. Але ж гэта цікава: як пражываюць сваё жыццё людзі вакол? І хаця лёс іншага — не твой лёс, падказкі, адказы на ўнутраныя пытанні раскіданы паўсюль.

Я звярнулася да людзей свайго пакалення: тых, хто ўжо адолеў не заўжды простыя дзянькі выбару прафесіі. Гарачанькае абітурыенцтва, непаўторнае студэнцтва — успаміны! Дарослае жыццё — з зарплатай, а не са стыпендыяй, без хатніх заданняў, адзнак і іспытаў, з чарадой працоўных дзён падобнай формы распачалося нядаўна. І як жа яно складвалася? Ды па-рознаму!

Гісторыя № 1: пра тое, як Ірына стала журналістам. Хаця і не была тым, хто піша...



Аднойчы, у студэнцкія гады, я пачала адчуваць, што мая аднагрупніца Ірына Машэзава захапляльная асоба. Мяне натхнялі яе энергічнасць, смеласць і мэтанакіраванасць. Ну, самі ведаеце такіх людзей! Цяпер Ірына жыве ў Санкт-Пецярбургу і працуе не дзе-небудзь, а па спецыяльнасці — журналістам у піцерскай газеце. І, у цэлым, сваім лёсам задаволена.

— Да ўступнай кампаніі заставаліся два месяцы. Я перажывала, не магла выбраць, чым займацца ў будучыні. Аднойчы ўвечары, седзячы перад тэлевізарам і гартаючы кніжку са спісам ВНУ, я ў адчаі запыталася ў бацькоў: «Ну, і куды ж мне паступаць?» Тата, доўга не думаючы, адказаў: «Паступай на журфак». Я не прыняла гэтую прапанову. Як я магу стаць журналістам? Для мяне гэта было проста нерэальным, да таго ж я не разглядала для сябе перспектыву стаць чалавекам, які нешта піша. Але раніцай я прачнулася з пачуццём, што менавіта ў гэтую прафесію мушу прыйсці. Стала рыхтавацца да іспытаў і друкавацца ў мясцовай прэсе. З першага разу на бюджэтнае я не паступіла. Юнацкі максімалізм мне сказаў: «Як гэта я буду вучыцца на платным?» З'ехала ў родны горад і там паступіла на гісторыка-філалагічны факультэт Полацкага ўніверсітэта. Але, адвучыўшыся крыху больш за тры месяцы, зразумела: не маё гэта. Ды і перспектыва стаць настаўнікам не прываблівала. Я забрала дакументы і стала рыхтавацца да паступлення на журфак. Паралельна супрацоўнічала адразу з некалькімі рэдакцыямі і па іх заданнях пісала матэрыялы. Вось так загарэлася ідэяй, ператварыла мару ў рэальнасць.

А потым мне тата сказаў, што сам калісьці марыў стаць журналістам і што ўва мне рэалізаваў сваё жаданне.

— Некаторыя кажуць, што атрымліваць вышэйшую адукацыю патрэбна, каб пашыраць светапогляд. Пагодзішся?

— Навучанне ва ўніверсітэце дае магчымасць раскрыць свае здольнасці: зразумець, ці можаш ты на сябе браць адказнасць, ці можаш прымаць рашэнні ў крытычных сітуацыях. Безумоўна, часам светапогляд не проста пашыраецца, але і цалкам змяняецца. Нават у працэсе навучання ты сутыкаешся з чымсьці новым. І калі падабаецца, то зацягвае. Менавіта ва ўніверсітэце я пазнаёмілася з усходняй філасофіяй, якая мяне вельмі захапіла. І цяпер яна сваімі пастулатамі і адносінамі да жыцця дапамагае мне вырашаць цяжкасці, што непазбежна здараюцца ў журналісцкай дзейнасці.



Гісторыя № 2: пра тое, як Ганна стала актрысай. Хаця і не марыла...

З Ганнай Шыкуць, якая прыкметна тым, што рыжая, нас звязала школа. Цяпер Ганна здымаецца ў кіно і, скончыўшы Акадэмію мастацтваў, працуе актрысай у Тэатры беларускай драматургіі.

— Я не ведала, кім хачу быць. Ці поварам, ці цырульнікам, ці на мяжы служыць. Але вучылася ў музычным класе. Настаўнікі казалі, што ў мяне добры голас, і накіравалі паступаць у музычнае вучылішча імя Глінкі. Я туды паступіла. Але на платнае. Грошай як не было, так і не з’явілася. Адмовілася. Перажыла жахлівае лета: усе паступілі, а я — ніхто. Што рабіць?! Спрабавала працаваць. Афіцыянткай, сакратаром, яшчэ кімсьці. Нецікава. А ў жніўні мяне запрасілі паздымацца ў масоўцы для кіно. Вось гэта аказалася цікава! І ў вучылішча мяне ўсё ж такі ўзялі бясплатна! Камісія, аказалася, памылілася. Маўляў, яны вельмі хацелі мяне ўзяць, але нейкія невядомыя ім сілы перашкодзілі, чаму яны самі не рады. У гэты ж самы час (ужо нават не памятаю, хто той добры чалавек) мне параілі народны тэатр «Жывая Планета». Прыйшла, абсалютна не ўяўляючы, што такое тэатр. І засталася. Даведалася шмат карыснага і нават неабходнага ў прафесіі, пра што потым, у Акадэміі мастацтваў, нават і не пачула. Так год пасля сканчэння школы і прайшоў: масоўкі ў кіно, тэатр, вакал у вучылішчы.

Актрысай, як і прынцэсай, быць не хацела ніколі. Заўжды думала, што акцёрамі становяцца толькі дзеці мам-актрыс і тат-рэжысёраў. У мяне звычайныя цудоўныя працоўныя бацькі... Ды і ніколі не назіралася ні схільнасцей,

ні прагі да гэтай дзейнасці. Аднак у той час, аналізуючы пражыты пасля школы год і робячы высновы, я зразумела, што ўсе магчымасці, усе сюрпрызы, нават самыя нечаканыя, якія прыносіць лёс, трэба выкарыстоўваць. Былі пакуты выбару: Акадэмія і акцёрства (што мне цьмяна ўяўлялася нават у марах) альбо вучэльня і вакал, дзе я ўжо ўпэўнена сябе адчувала, ведаючы свае здольнасці і магчымасці. Карацей, я паступіла ў Акадэмію — і стала актрысай.

Гісторыя № 3: пра тое, як гуманітарый Алесь трапіў у тэхнічны ўніверсітэт



З Алесем Герасіменкам мы пазнаёміліся ў сеціве — на форуме беларускамоўнай моладзі. Я захаплялася яго разгорнутымі развažаннямі і разумела, што чалавек ён з творчым мысленнем.

У школе выдатнікам быў: і нават не таму, што трэба добра вучыцца, а таму што — цікава! Салодкай калыханкай сталіся такія прадметы, як геаграфія і гісторыя. Карацей, таленавіты гуманітарый. І з гэткім розумам — у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Вядома, нешта не тое...

— Я паступіў у тэхнічны ўніверсітэт, не пабачыўшы добра, што ў назве будучай спецыяльнасці значыцца «матэматык, сістэмны праграміст». Не тое, каб мне не падабалася ў тэхнічным універсітэце. Проста хацелася нечага гуманітарнага: размоў пра Канта, дыскусій пра будучыню паўночнаатлантычнай супольнасці. Было шмат рознага праграмавання, якое патрабавала багата часу, а мілай сэрцу эканомікі, філасофіі і культуралогіі мала... Таму навучанне часам адбывалася даволі нервова і, бывала, пакутліва.

Алесь недавучыўся да канца на дзённым. І, нягледзячы на супярэчнасці з бацькамі, перавёўся на завочнае. Паступіў на факультэт паліталогіі ў Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт.

— Цяпер я крыху карыстаюся тымі ведамі, што атрымаў у БДУІРы. Дакладней, спалучаю іх з іншымі, якія спазнаю падчас цяперашняга навучання. Атрымалася досыць грымучая сумесь — паліталагічна-матэматычна-праграмісцкая адукацыя. Але і ўнікальная, асабліва калі да яе дадаць яшчэ крыху ведання моў. Бо калі пачынаеш працаваць, то важнымі становяцца не паперкі, дзе напісана, хто ты, а тое, што ты можаш зрабіць і як гэта можаш падаць. У нейкім сэнсе я, канешне, памыліўся. Але памыліцца можна. Галоўнае — здолець потым пераўзысці свае страхі, прызнаць памылку і выправіць яе.



Гісторыя № 4: пра Дзіму, які кінуў універ і не пашкадаваў

Спачатку я пачытала livejournal Дзімы Бякіна. Асабіста мы пабачыліся на наступны дзень. Мяне ўразілі адкрытасць жыццю і інтарэс да людзей гэтага чалавека.

— Калі я быў абітурыентам, то фанацеў ад «Уладара пярсцёнкаў» і «Хобіта». Мой улюбёны пісьменнік быў лінгвістам. Я таксама вырашыў вывучаць мовы і лінгвістыку: паступіў на аддзяленне сучасных замежных моў факультэта міжнародных зносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Студэнцкія гады былі адначасова і сумнымі, і цікавымі. Існавалі такія дысцыпліны і выкладчыкі, якія мне вельмі падабаліся. Мовазнаўства, замежная літаратура, яўрэйскае Свяшчэннае пісанне Танах і старажытныя літаратуры Усходу. Сучасныя мовы здаваліся сумнымі, а вось іўрыт, лацінская, старажытнагрэчаская — падабаліся. Яны былі «ўваходам» у старажытную культуру.

— Але ўніверсітэт ты кінуў, так і не атрымаўшы дыплом...

— Мне не падабалася сістэма ў цэлым. Я такі чалавек, для якога свабода — вышэйшая каштоўнасць. Я ўжо ў школе адчуваў, што мне не хочацца штодзень наведваць заняткі і выконваць хатнія заданні. Мне было цікава вывучаць прадметы самому, займацца па сваёй праграме. Так я дасягаў большых вынікаў. Ва ўніверсітэце адчуваў сябе часткова як за кратамі. Тым больш, што на трэцім курсе старажытныя мовы скончыліся, цікавыя прадметы і выкладчыкі — таксама, і я зразумеў, што мяне тут больш нічога не трымае, і працягваць вучыцца далей было абсалютна сумна і бессэнсоўна. Таму і кінуў універсітэт. Для шкадавання няма часу. Ёсць дзеянне, жыццё...

Аўтсайдараў не бывае! Бываюць розныя людзі і розныя лёсы. Разгубленасць змяняецца ўпэўненасцю. А той, хто імпэтна шукае, урэшце знаходзіць.

Кацярына БЕЗМАЦЕРНЫХ

Быць альбо не быць рэпетытару ў тваім жыцці?

Калі я вучылася ў 11 класе, заўжды чула ад сваіх сяброў, што ў наш час без дапамогі рэпетытараў не паступіш, асабліва на бясплатнае навучанне.

Бацькі шукаюць для нас найлепшых рэпетытараў, марнуюць велізарную суму грошай, спрабуюць хоць чымсьці дапамагчы. Але, як паказвае практыка, нават тыя дзеці, якія ходзяць да прыватных настаўнікаў, не заўсёды паказваюць добры вынік на ўступных іспытах. І ўзнікае пытанне: ці варта наймаць рэпетытара?


Дыктоўкі добра пісала, а тэст «заваліла»

«Рэпетытар — гэта свайго роду трэнер, — кажа **Вольга Шэдрычава,** рэпетытар англійскай мовы. — Яго задача — удасканаліць навыкі вучня, раскласці веды “па палічках”, каб дзіцяці ўсё было зразумела».

У наш час знайсці патрэбнага рэпетытара проста. Існуе мноства агенцтваў і сайтаў, дзе вывешваюць свае абвесткі прыватныя настаўнікі. Іх можна сустрэць у газетах «Из рук в руки», «Работа для вас» і гэтак далей. Усе рэпетытары абяцаюць толькі станоўчы вынік, за добрую плату адпаведна. Але, як я казала раней, не заўсёды бацькі і дзеці застаюцца задаволены вынікамі на цэнтралізаваным тэсціраванні.

Я была абітурыенткай у 2011 годзе. І, вядома, па прыкладзе сваіх аднакласніц, наняла рэпетытара па рускай мове. За ўрок (а ён доўжыўся паўтары гадзіны) я плаціла адносна няшмат — усяго 10 тысяч беларускіх рублёў.

Мне падабалася займацца індывідуальна. Я стала шмат чаго разумець, «лапіла слабыя месцы» ў сваіх ведах, апярэджвала школьную праграму. І самае прыемнае тое, што дыктоўкі пісала на адны дзявяткі і дзясяткі. Карацей, вынік быў відавочны! Але вось толькі цэнтралізаванае тэсціраванне я чамусьці здала на 29 балаў. Вы не падумайце, я вельмі старалася, уважліва рабіла кожнае заданне, але... напісала на нізкі бал!..



І ўсё-такі метад «тыку» дзейнічае!

Чаму ж так атрымліваецца? Працуеш з рэпетытарам, вучыш, пачынаеш нешта разумець, але ўсё роўна здаеш тэст не на той вынік, які чакаў!

У Пінску ў 2010 годзе праходзіла рэпетыцыйнае тэсціраванне. Яго вынікі здзівілі выкладчыкаў. Педагогі выявілі, што тыя хлопцы і дзяўчаты, якія ўпарта рыхтаваліся да паступлення, правалілі тэсты. Затое троечнікі набралі высокія балы.

Гэты выпадак можна растлумачыць тым, што чалавеку, які думае, уласціва сумненне: пакуль добрыя вучні разважалі над заданнем, троечнікі, хто з дапамогай інтуіцыі, хто метадам «тыку», выбіралі варыянт адказу.

Здаць тэсты няпроста, нават калі за плячыма не толькі сярэдняя школа, але і вышэйшая адукацыя ды немалы жыццёвы вопыт. «Я здавала ЦТ без падрыхтоўкі рэпетытараў і паступіла на бюджэтнае навучанне, — кажа **Іна Разанцава**, студэнтка 1 курса педагагічнага ўніверсітэта. — Але павінна сказаць, што тэсты — гэта фартуна. Часам трапляюцца такія пытанні, на якія ты не толькі не можаш адказаць, але нават не можаш зразумець, чаго ад цябе хочуць!»

Веды — гэта веды!

Калі на цэнтралізаваным тэсціраванні лепш уключаць не свой мозг, а інтуіцыю, ці варта марнаваць грошы на прыватныя ўрокі?

«Вядома, у цэнтралізаваным тэсціраванні не абыдзешся без фактару “шанцавання”, але ж не варта здымаць з рахункаў веды, — распавядае **Галіна Жук**, настаўніца матэматыкі ў школе № 1 г. п. Смілавічы. — Пры цяперашніх умовах паступлення лепш за ўсё наняць рэпетытара, але гэта толькі ў тым выпадку, калі ты не маеш сілы волі, якая, як мы ведаем, ёсць не ва ўсіх вучняў. Калі ты можаш пасадзіць сябе за стол, узяць кнігу і самастойна разабраць матэрыял, то рэпетытар табе не спатрэбіцца. Заняткі ў класе не заўсёды даюць магчымасць настаўніку засяродзіцца на нейкім адным вучні, а прыватныя ўрокі разлічаны толькі на адно дзіця. У такой цеснай атмасферы можна лёгка знайсці слабыя месцы вучня, дапамагчы выправіць яго памылкі і падцягнуць веды».


А яшчэ для таго, каб паразумнець, табе можа дапамагчы не толькі рэпетытар, але і школа. Акрамя звыклых урокаў ёсць яшчэ і факультатывы, на якіх ты можаш задаць любое пытанне па незразумелым табе матэрыяле. Галоўнае — не ленавацца і мацаваць, як спартсмен — цягліцы, сваю ўпартасць здабываць веды!

Жадаю ўсім абітурыентам 2012 года здаць ЦТ на выдатна!

Марыя СЯЦКО,
18 гадоў,
фота аўтара

● **Слоўнік-алоўнік**

Багоўкі



Багоўка — «божая кароўка: жучок чырвонай, жоўтай або белай афарбоўкі з плямкамі».

Багоўка ў тваёй далоні.
Як кропля цёплая крыві.

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ

Уявім для запамінання: сцяна, а на ёй напісана мелам, вялікімі літарамі — «**БАГОЎКА**». І багоўкі вакол паўсюдныя…

Горад акупаваны багоўкамі

Тут рэдка сустрэнеш муху, трохі часцей, матылька, але **багоўкі** напрыканцы ліпеня — яны паўсюдна. На падаконні, на парэнчах, на старонках кніг, на мне: дзве на рукаве, адна ў валасах, яшчэ адна адольвае цяжкі шлях ад прарэху да калена. «Глядзі, **багоўка**!» — кажа дачка, працягваючы раскрытую далонь, і ў голасе дачкі ўжо не чуецца былога захаплення. Часам падаецца, што яны хрумсцяць пад нагамі, тыя **багоўкі**. Сама па сабе **багоўка** выклікае замілаванне, але ў такой колькасці баговак навокал ёсць нешта апакаліптычнае.

Седзячы на лаўцы ў парку, я вырашыў дакурыць рэшткі тытуню, што яшчэ заставаліся, паднёс да люлькі запалку і ў апошні момант заўважыў **багоўку**, якая сядзела ўнутры, бы агеньчык, застылы ў попеле.

Альгерд БАХАРЭВІЧ

Як толькі беларускі народ — у розных рэгіёнах нашай краіны, на розных дыялектах — не называе **багоўку**!

Богава кароўка і **богава цялушка**, **андрэйка-салавейка**, **андрэйка-бажок**, **казулька**, **полік**, **бобрык**, **карбачок, анцюн-паланцюн, педурка-седурка, ляпошачка**, **хведар, петра-паўла, педрык, мурашка-пумпашка, матрунка…** І шмат іншага!

Кацярына БЕЗМАЦЕРНЫХ

Малюнак Вольгі АЛЕЙНІКАВАЙ, 7 клас, гімназія № 25 г. Мінска

● **Дынамік**

Дуда ў року

Стары Вох і ўсе, усе, усе...

Барабан, дуда, добрая кампанія — вось асноўныя кампаненты, неабходныя сярэднявечнаму музыку і аматару фольку для камфортнага самаадчування і магчымасці хоць штосьці граць. Гэта датычыць як выканаўцаў у старажытныя часы (хоць дакладна мы не можам сёння сцвярджаць, але думаю, так яно і было), так і сучасных акустычных гуртоў, што граюць сярэднявечную музыку. Але, як ні дзіўна, сярод тых, хто захапляецца сярэднявеччам, збірае фальклор у глыбі Палесся, захоўвае пад ложкам наноў зробленыя ідалы Перуна і Вялеса, марыць пра адраджэнне ВКЛ, знаходзяцца «экспанаты», якія ведаюць, як граць на электрагітары, падключаць узмацняльнік і калонкі, а галоўнае — спалучаць элементы паганства, сярэднявечча, фольку з рокавым і электронным гучаннем. Гэтых прадстаўнікоў музычнай фаўны можна класіфікаваць па-рознаму: фольк-мадэрн, фольк-метал, фольк-рок, pagan-метал... Але класіфікуй, не класіфікуй — усё роўна атрымаеш адно: ДУДУ! Гурты Znich, Unia, раннія Weeping Twilight, Vicious Crusade (некаторыя рэчы), Osimira, «Камаедзіца» звяртаюцца да гэтага сакральнага для нас інструмента. Думаецца, з пералічанымі бэндамі няма сэнсу знаёміць чытачоў, таму звярнуся да падрастаючага пакалення гібрыдаў — гуртоў змешанага жанру новай генерацыі. Яны хоць і маладыя, але асноўную ісціну засвоілі добра. То бок, калі іх разбудзіць уночы, яны скажуць: без дуды не было б і нашага гурта.

Добры доктар Троль

Калі б музычныя каманды размнажаліся метадам пачкавання, то гурт Litvintroll можна было б смела назваць адпачкаваным дзіцём «Старога Ольсы» (яго стварылі бубначы Андрэй Апановіч і Сяргей Тапчэўскі), па шчырасці, не пашанцавала бацькам — гэтакае складанае дзіця. Ці, можа, дрэннае выхаванне? На сцэне вырабляюць незразумела што, палiваюць публіку вадой падчас фэстаў, выконваюць каверы на песні замежных гуртоў, кшталту Judas Priest, у цэлым, паводзяць сябе як сапраўдныя металісты. Самі хлопцы стыль сваёй музыкі называюць Rock'n'Troll. Пагадзіцеся, гэтакі пералік характарыстык выклікае шмат пытанняў. Каб знайсці на іх адказы, я звярнулася да Васі Верабейчыкава, Троля, які ў гурце грае на жалейцы, флейце, а галоўнае — дудзе.

— У музыцы гурта сустракаюцца як новыя інтэрпрэтацыі беларускіх народных песень, так і замежныя фальклорныя матывы. Ёсць нейкі прынцып іх выбару?

— Фазы месяца, кірунак ветру, курс ены — шмат фактараў уплывае на гэты выбар. Не так даўно нас штурхнула ўзяцца за польскі фольк — зрабілі сваю версію польскай народнай песні «Ліпка». Хоць, калі браць матэрыял, што мы рыхтуем для новага альбома, большая частка там аўтарская, з народных толькі тая самая «Ліпка» і беларуская песня «Камарова смерць».

— З надзейных крыніц паступіла інфармацыя, што сярод Троляў ёсць урач, дакладней, паталагаанатам. Гэты факт робіць музыку больш брутальнай?



Гурт «Літвінтроль».
Фота Алега Белавусага.

— Паталагаанатам увогуле вельмі філасофская прафесія. Увесь час разважаеш пра мізэрнасць існавання і сузіраеш сумны фінал жыцця. Якая тут брутальнасць? Наш добры доктар, хутчэй, прыўносіць у музыку складаную гармонію і ламаныя рытмы.

— Добра, тады сур'ёзнае пытанне: месца дуды ў музыцы гурта?

— Галоўнае, канечне! Якое яшчэ, асабліва калі на гэтае пытанне адказвае дудар. Дуда — інструмент, які саліруе, яе вельмі складана загнаць на другі план. Да таго ж гэта магічны інструмент — дуду так проста не заткнеш!

— Вы зрабілі кавер на знакамітую песню Breaking the Law. Які law хочаце break сваёй музыкай?

— Усё атрымалася выпадкова. Я ехаў на рэпетыцыю, а ў машыне граў Judas Priest. У студыі я пад уражаннем найграў пачатковы рыф Breaking the Law, а ўсе астатнія падхапілі. Так і атрымаўся кавер. Так што спецыяльна мы ніякіх законаў парушаць не хацелі.

А хаця, калі прыглядзецца, вельмі нават добрыя хлопцы. Адукаваныя, культурныя, можна сказаць, дарма што Тролі. За такіх выхаванцаў можа не саромецца нават іх дырэктар спадар Сасноўскі. Тым больш што на падыходзе — новы альбом. Кружэлка Rock'n'Troll з меладычнымі баладамі, народнымі песнямі і класічным хэві-металам парадавала не толькі беларусаў, але і замежнікаў. Таму чакаем! Можа, не ўсе, я дык дакладна!

Куцця для козліка Бенедыкта

Іх называюць панкамі, псіха-фольк-гуртом, самі яны сцвярджаюць, што ў іх музыцы ёсць усе гэтыя рысы. Па-панкаўску хваляцца тым, што рэзалі рыбу на газеце, у якой пра іх пісалі, сцвярджаюць, што па духу ім блізкі гурт з сумнеўнай рэпутацыяй Bloodhound Gang. Але, нягледзячы на гэта, вядуць здаровы лад жыцця, вельмі любяць малако (нават падчас размовы са мной Вячка і Васіль



Надзея Працько, гурт Раша.
Фота Таццяны Сакаловай.

з задавальненнем, глыток за глытком, папівалі карысную белую вадкасць з літровых пластыкавых бутэлек). Іх, як сапраўдных панкаў, ужо на ўваходзе ў клуб ідэнтыфікуюць: «А, гэта тыя, яны нам сёння зноў устрояць!» Але псіхадэлічны аспект выдае першапачатковая назва гурта — «Куцця святога козліка Бенедыкта».

— Мы нават тэлефанавалі Зміцеру Сасноўскаму, каб сказаць, што пад такой назвай будзем выступаць на Калядным фэсце, — распавёў музыка гурта Васіль Саковіч. — Але ён не ўзяў трубку... Гэта быў ракавы момант. Магчыма, мы і цяпер былі б шырока вядомы як «Куцця святога козліка...», але тады давялося прыдумаць іншую назву. Сёння гурт называецца не менш міфічна і псіхадэлічна — «Кашлаты Вох». З усіх, хто ў нас пытаўся пра сутнасць гэтай назвы, дакладней, тое, хто такі Вох, толькі Дзяніс Сухі ведаў дакладны адказ. Таму, калі будзе цікава, запытайцеся ў яго.

— Мы так назваліся, каб было зручна на танцпляцоўцы скандзіраваць «Каш-ла-ты-вох», — дадае вакаліст і дудар Вячка Красулін.

Хто такі Вох, я ведаю (і сапраўды, калі вам цікава, запытайцеся ў Дзяніса Сухога, або пачытайце ў інтэрнэце), таму распавяду, што дазналася пра каманду з нашай кароткай гутаркі падчас сустрэчы «Дударскага клуба».

Спачатку «Кашлаты Вох» існаваў як акустычны гурт, граў народныя мелодыі, па сутнасці тое, што ўсе гралі. Потым шукалі арыгінальныя кампазіцыі, каб не быць падобнымі да іншых, пачалі граць з гітарай, басам і бубнамі. Некаторыя «старыя» песні перайшлі ў электрычнасць, некаторыя ўжо нарадзіліся самі. Альбома пакуль няма. Але, як сцвярджаюць хлопцы, матэрыял для яго ўжо ёсць. Таму чакаем!

Сапраўды чакаем, бо, па шчырасці, нейк крыўдна было, калі на іх першы сольнік прыйшло толькі 3 (!) слухачы. Дарэчы, у іх ліку была і я. Магчыма, іх сапраўды спужаў «гатычны дождж», ці шырокая публіка не разумее канцэптуальнасці музыкі і адметных паводзін на сцэне саліста гурта. Насцярожаныя гледачы падчас выступленняў нават пытаюцца: ці не ўжывае ён што-небудзь больш эфектыўнае, чым малако і нават піва? Не буду расказваць, у чым фішка, самі як-небудзь пабачыце, але Вячка свае паводзіны тлумачыць так:

— Я нічога амаральнага не раблю. У маіх паводзінах вінавата прапаганда папуляцыі грыбнікоў, таму яны безумоўна канцэптуальныя.

Ну як, заінтрыгавала? Далучайцеся! І дам адну параду, без якой вам складана будзе паразумецца з Вохам, дакладней, адагнаць яго. Калі ў вас з сабою ў момант сустрэчы з музыкам гурта ёсць малако ці хоць якія малочныя прадукты, адразу аддайце ім. Бо ўсё роўна выпрасяць. Ведаю з уласнага вопыту.

Пава, арбайтэн!

Кіраўнік праекта Pawa дудар Юрась Панкевіч, больш вядомы як музыка з Testamentum Terrae, настойліва мяне запрашаў на рэпетыцыю новага гурта. Іх канцэртаў у Мінску пакуль не было, выйшаў альбом Pawa (дарэчы, даступны для спампоўвання на сайце кампаніі «Будзьма»), і сэнс майго наведвання быў у тым, каб я пачула, што жывое гучанне значна адрозніваецца ад альбомнага. І гэта сапраўды так! Я нават выявіла, што ў іх ёсць электрагітара, якой у альбоме зусім не чутно. А яшчэ (і гэта галоўнае!) — каб я ўпэўнілася, што песні выконваюцца ўжывую і гэта не проста рэміксы з альбома Angleza вышэйзгаданага Testamentum Terrae, а новая версія кампазіцый.

Вы ўжо напэўна здагадаліся, што мы зноў маем справу з «адпачкаваным» дзіцём, але тут нават «двайное адпачкаванне»: не толькі музыкаў, але і музыкі. На пытанне пра мэту стварэння праекта яго «бацька» Юрась Панкевіч адказвае проста:

— Таму што я дабіў. — І толькі потым дадае: — Мы вырашылі не проста «варыцца ў сваім супе», дзе вядомыя ўсе ўдзельнікі працэсу, а на канцэрты прыходзіць моладзь, якая захапляецца народнымі танцамі. Важна, каб музыка была даспадобы ўсім, каб простыя людзі адчувалі, што сучаснасць і мінуўшчына звязаны. Мне даўно хацелася граць такую музыку, а астатніх я ўсіх прымусіў.

Праект пазіцыянуецца як прынцыпова новы ў нашай музыцы. Так, былі рэміксы ў іншых гуртоў, але на гэты раз усё не так. Спачатку Testamentum Terrae грае сярэднявечную мелодыю ў звыклым акустычным гучанні, а ўжо пазней яе апрацоўваюць «электроншчыкі», і новы варыянт выконвае Pawa. І сапраўды, лагічна.

— Мы планавалі граць такую музыку ўжывую, — распавядае Юрась, — гэта была асноўная мэта. Цяпер рыхтуем праграму, рэпеціруем, і ў хуткім часе паспрабуем яе зайграць у «Дударскім клубе».

Нягледзячы на крытыку з боку знаўцаў музыкі, звычайным слухачам усё падабаецца. Крытыкі сцвярджаюць, што новыя варыянты песень — гэта рэміксы і што такое ўжо было. Панкевіч крыўдуе і кажа, што гэта наша беларуская рыса — ганіць сваё, а калі яно стане запатрабаваным за мяжой, наноў успрымаць яго як геніяльнае.

Як бы там ні было, працэс падрыхтоўкі ідзе. І нездарма ж Юрась на рэпетыцыях усіх дысцыплінуе гучным «Арбайтэн!» Думаю, вынік будзе. Станоўчы. Тым больш, што ад жывога выступлення і выпуклага, аб'ёмнага гучання сапраўды складваецца больш яркае ўражанне, чым ад пляскатага альбома. Ну і натуральна, дуда тут таксама на адным з першых месцаў. У прынцыпе, як і заўсёды. Гэта таксама беларуская рыса.

Марына ВЕСЯЛУХА

Льготная падпіска для ўстаноў
Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь. Ведамасны льготны індэкс — 00731;
падпісная цана на 1 месяц — 21 880 руб.

Індывідуальная падпіска. Індэкс — 74957. Цана на 1 месяц — 12030 руб.
Ведамасная падпіска. Індэкс — 749572. Цана на 1 месяц — 27 680 руб.

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў. Індэкс — 00592.
Цана на 1 месяц — 8470 руб.

Дызайн вокладкі *Веранікі ШНІП,* фота на вокладцы *Кастуся ДРОБАВА*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *Святланы СТАРАВЕРАВАЙ*
Стыльрэдактар *Кацярына ГОЛУБ*

Рэдакцыя не ўступае ў перапіску з чытачамі, не рэцэнзуе і не вяртае дасланыя рукапісы.
При передруку спасылка на «Маладосць» абавязковая.

Юрыдычны адрас: 220005, Мінск, пр. Незалежнасці, 39.
Паштовы адрас: 220034, Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: 284-85-24, 284-41-88, 288-20-72.

Падпісана да друку 10.04.2012. Фармат 84×108 $^{1}/_{16}$. Папера газетная. Друк афсетны. Умоўн. друк. арк. 15,12.
Ул.-выд. арк. 13,48. Тыраж 2497 экз. Заказ 1048. Кошт нумара ў розніцу 12 300 руб.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009 г.

Часопіс «Маладосць» зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі РБ. Рэг. нум. 16.

maladost@bk.ru **http://maladosc.livejournal.com**

Заснавальнікі — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь;
грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»;
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва»